# Веснік Глыбоччыны

Вішнёвы фестываль

Газета раённага выканаўчага камітэта і раённага Савета дэпутатаў

серада, 20 ліпеня 2016 года № 57 (9609)


# З фестывалем!



Фотакалаж Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

## Паважаныя глыбачане, землякі, шаноўныя госці!

**Сардэчна вітаем вас на «Вішнёвым фестывалі» ў Глыбокім!**

Кожны год вясной наш горад патанае ў белай квецені вішань, а ўлетку яны радуюць нас багатым ураджаем чырвоных сакавітых ягад. Калісьці вішнёвыя сады на Глыбоччыне заклаў мясцовы аграном Баляслаў Лапыр. З яго садоў салодкая і зімаўстойлівая вішня ступіла спачатку ў тутэйшыя сялянскія сядзібы, а потым распаўсюдзілася па ўсім нашым краі. І да гэтага часу слава пра глыбоцкія вішні перадаецца з вуснаў у вусны.

Ужо ў чацвёрты раз «Вішнёвы фестываль» збірае сяброў на яркае, рознакаляровае, са смакам вішні, свята. Спадзяёмся, што і сёлетні фестываль спадабаецца ўсім, стане месцам новых знаёмстваў і цікавых сустрэч людзей, якія любяць і цэняць прыгажосць.

Народная мудрасць гаворыць, што кожны ў сваім жыцці павінен пасадзіць дрэва, пабудаваць дом, выгадаваць дзіця. Будуецца наш горад, падрастаюць нашы дзеткі, і расце на радасць будучым пакаленням вішнёвы сад.

Азіраючыся ў гістарычнае мінулае, шануючы традыцыі і працоўныя набыткі бацькоў і дзядоў, мы павінны яшчэ больш натхнёна і плённа працаваць дзеля дабрабыту нашай Бацькаўшчыны, пакідаць свой адметны след на гасцінцы жыцця, каб і праз гадоў гэтак пяцьсот нашчадкі ўспомнілі добрым словам пра заслугі сваіх папярэднікаў.

Дык няхай жа па вуліцах і плошчах Глыбокага на працягу ўсяго гэтага тыдня крочыць "Вішнёвы фестываль"! Жадаем вам, паважаныя землякі і госці, цікавых сустрэч, карысных дыялогаў, творчага ўзлёту і душэўнай радасці, шчырых пачуццяў ад такой значнай падзеі ў жыцці нашага горада. Мілагучных нот, светлых напеваў, яркіх пачуццяў і незабыўных уражанняў усім вам! Са святам!

***А. В. МОРХАТ, старшыня Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта,***
***Г. У. УНУКОВІЧ, старшыня Глыбоцкага раённага Савета дэпутатаў.***

# На бясконцай прасторы Інтэрнэту

• Анатоль ЗІНКЕВІЧ. Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

З кожным годам расце папулярнасць "Вішнёвага фестывалю" ў Глыбокім. І ў пацвярджэнне таму, што сёлета кола сяброў фестывалю пашырылася ў многа і многа разоў, стаў не так даўно створаны афіцыйны сайт "Вішнёвага фестывалю". Банер з актыўнай ссылкай на гэты сайт размешчаны на галоўнай старонцы сайта ўстановы "Рэдакцыя раённай газеты "Веснік Глыбоччыны Глыбоцкага раёна". Яго аўтарам з'яўляецца галоўны рэдактар раённай газеты Андрэй Панкрат. А сама ідэя па рэалізацыі такога праекта была падказана старшынёй раённага выканаўчага камітэта Алегам Віктаравічам Морхатам. І вось дзесьці два месяцы таму, даручэнне кіраўніка раёна было выканана: афіцыйны сайт "Вішнёвы фестываль" прадстаўлены на бясконцай прасторы Інтэрнэту.

Для тых, хто яшчэ не паспеў пазнаёміцца са зместам сайта "Вішнёвы фестываль", скажам, што зайсці на яго вельмі проста. Паўтаруся: банер з актыўнай ссылкай размешчаны на нашым рэдакцыйным сайце. Ужо адкрыўшы галоўную старонку і актывізаваўшы ў тэксце ўступнай інфармацыі выдзеленыя словы "здесь" і "Баляслаў Лапыр", можна адразу пазнаёміцца з гісторыяй фестывалю, даведацца пра тое, як яшчэ пры "польскім часе" мясцовы аграном Баляслаў Лапыр прывёз і пасадзіў марозаўстойлівыя вішні ў Глыбокім, як гэтыя вішні потым распаўсюдзілі глыбачане па ўсім нашым краі. У цэлым на афіцыйным сайце "Вішнёвы фестываль" пададзена інфармацыя пад 10 рубрыкамі. Напрыклад, пад рубрыкай "Вішнёвая творчасць" змешчаны вершы паэтаў пра вішнёвую прыгажосць. Вельмі папулярная ў наведвальнікаў сайта рубрыка "Вішнёвыя рэцэпты".

У гэтыя фестывальныя дні найбольшую цікавасць праяўляюць нашы госці да інфармацыі пад рубрыкамі: "Як даехаць да Глыбокага", "Гасцініцы", "Сувязь з арганізатарамі", "Сімвалы фестывалю" і, канешне ж, "Хроніка фестывалю", дзе можна не толькі пачарпнуць інфармацыю, але зазірнуць на наш, глыбоцкі, "Вішнёвы фестываль" 2013, 2014 і 2015 гадоў, бо тут размешчана шмат фотаздымкаў, ёсць і відэаматэрыялы.

Ну а ўжо сёння пішуцца новыя радкі, складаецца летапіс чацвёртага "Вішнёвага фестывалю". Самыя яркія падзеі і мерапрыемствы цяперашніх фестывальных дзён абавязкова знойдуць сваё адлюстраванне на афіцыйным сайце "Вішнёвы фестываль", які, вядома ж, будзе ўдасканальвацца і, упэўнены, займее самую шырокую папулярнасць.




# Вуліца чакае навасёлаў

• Галіна СУТУЛА.

**"Па-суседству" з вуліцай Вясёлкавай у Глыбокім ужо спраектаваная вуліца Вішнёвая.**

Рашэннем райвыканкама ад 21 чэрвеня 2016 года зямельныя ўчасткі пад індывідуальнае будаўніцтва прыватных дамоў №№1,2,3,5,8,10 і 14 выдзелены сям'і маладым сем'ям, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Праз некаторы час маладыя гаспадары і гаспадыні справяць тут наваселле, спадзяёмся, пасадзяць вішнёвыя дрэўцы і будуць у згодзе і любові гадаваць дзетак.

# Бясплатная кансультацыя – у падарунак

• Г. ЗВОНКА.

**Супрацоўнікі натарыяльнай канторы Глыбоцкага раёна Віцебскай натарыяльнай акругі з'яўляюцца пастаяннымі ініцыятарамі цікавых ідэй. І да "Вішнёвага фестывалю" падрыхтавалі свой падарунак – бясплатныя кансультацыі на працягу ўсяго тыдня, з 18 па 23 ліпеня.**

--Падобныя акцыі мы праводзім даўно напярэдадні прафесійных і знамянальных для краіны дат: Дня вызваліцеля... Дня выратавальнікаў, міліцыі, пажарнай службы, да Дня Вялікай Перамогі, -- гаворыць загадчык натарыяльнай канторы Аляксандра Кузьмінічна Сеўрукова. – Такім чынам мы выказваем сваю павагу людзям, якія ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікам самых мужных прафесій, якія стаяць на варце нашага спакою і грамадскай бяспекі. Падчас правядзення "Вішнёвага фестывалю" бясплатную кансультацыю па любых пытаннях могуць атрымаць усе жыхары горада і раёна, а таксама прыезджыя госці, прыйшоўшы на асабісты прыём. Усіх, у каго ёсць пытанні па сутнасці, але пакуль няма адказу на іх, чакаем па адрасе: г. Глыбокае, вуліца Маскоўская, 10, другі паверх.

# «Вішнёвы фестываль» ... у Віцебску

• Алена ХАЙНОЎСКАЯ.
Фота Ігара МАТВЕЕВА (TUT.BY)
і газеты «Віцьбічы».

**Неверагодна, але факт: "Вішнёвы фестываль" распачаў свае мерапрыемствы тыдзень таму... у абласным цэнтры. Вішнёвая каралева разам са сваёй світай паўдзельнічала ва ўрачыстым шэсці, якое адкрывала "Славянскі базар у Віцебску".**




– Раёны Віцебшчыны прадставілі свае рэгіянальныя фестывалі, – патлумачыла галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Таццяна Мацюшонак. – У гэтым парадзе-імправізацыі, які арганізатары назвалі "25-ы сезон. Адкрыццё", гонар Глыбоччыны і фестывалю абаранялі Вішнёвая каралева з Вішанькай і юныя памочніцы *(на здымку)*. У святочным шэсці па віцебскіх вуліцах прайшлі таксама ўзорны ансамбль барабаншчыц "Віват" Глыбоцкага ГДК, узорны духавы аркестр Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў.

А потым на працягу ўсіх фестывальных дзён на пляцоўцы, якая разгарнулася на плошчы Свабоды, глыбачане паказвалі гасцям "Славянскага базару" "Вішнёвы фестываль" ва ўсёй красе. Розных вішанек ставала: і духмяных, сакавітых з глыбоцкіх дрэўцаў, і спечаных у смачных пірагах, піражках, булачках кандытарамі райспажыўтаварыства і хлебазавода, і нават у славутай нашай згушчонцы... "Глыбоцкімі гасцінцамі з вішнёвай сталіцы" захаплівалі.

– На тэматычнай тэатралізаванай пляцоўцы глыбоцкія вішні мы прэзентавалі ў рамках конкурсу брэндаў гарадоў і раёнаў вобласці, – расказала Таццяна Валер'еўна. – На нашым падворку ўстанавілі арку і агароджу з вішанькамі. Акрамя вішнёвай смакаты, прапанаўвалі ўсім наведвальнікам падвор'я буклеты, флаеры, рэцэпты з нашай брэндавай ягадкай. Свае вішнёвыя сувеніры прадставілі раённы Дом рамёстваў, Цэнтр дзяцей і моладзі, тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Рэкламавалі Глыбоччыну прадстаўнікі інфармацыйна-турыстычнага цэнтра і дзяржаўнай прыродаахоўнай установы "Галубаў сад". Усіх, хто заглядваў на "Вішнёвае падвор'е", чакала і культурная праграма. "Вішнёвыя" майстар-класы праводзілі метадысты раённага Дома рамёстваў: Кацярына Кляпацкая, Арцём Фамін, Марыя Фурс, Валерый і Алена Мацюшонкі, Віктар Дудкевіч, кіраўнік народнага клуба майстроў "Крыніца" Святлана Кавальчук. Глыбоцкія творчыя калектывы перадавалі эстафету адзін аднаму: спачатку ў захапляльныя танцы заклікалі ўдзельнікі народнага тэатра фальклору "Цярэшка", потым весялілі народны тэатр мініяцюр "Идущие на смех" Падсвільскага ГДК. Вішнёвымі касцюмамі і песнямі радавала вакальная група "Падсвільчанка"...


«Вішнёвы фестываль» запрашае.

Абарона тэматычнай пляцоўкі брэнда "Вішнёвага фестывалю" прайшла і на віцебскай сцэне. Рыхтавалі яе калектывы Глыбоцкага ГДК, у тым ліку і ўзорны ансамбль барабаншчыц "Віват", і народная студыя "Архіў".

– Каб пра ўсе падзеі і мерапрыемствы "Вішнёвага фестывалю" ў Віцебску ведалі, на сваім падворку мы размясцілі праграму, – адзначыла Таццяна Мацюшонак. – Падыходзіла шмат цікаўных, людзі чыталі, абяцалі прыехаць, асабліва радаваліся тыя, у каго якраз адпачынак.

Паколькі фестывальны Віцебск са "Славянскім базарам" перадаў эстафету Глыбокаму і "Вішнёваму фестывалю", чакаем вас у госці!

# Вішнёвае каханне Дзяніса і Анжалікі Вішнеўскіх

● Галіна СУТУЛА.
Фота з сямейнага архіва.

Адной з цэнтральных падзей IV "Вішнёвага фестывалю" стане адкрыццё ў суботу, 23 ліпеня, на Цэнтральнай плошчы Глыбокага скульптуры "Сям'я". Ідэя стварэння такой тэматычнай кампазіцыі належыць кіраўніку нашага раёна, старшыні раённага выканаўчага камітэта Алегу Віктаравічу Морхату.

І, трэба адзначыць, заканамерна тое, што такі творчы праект рэалізаваны на Глыбоччыне. Раённая ўлада за апошнія шэсць гадоў настойліва, мэтанакіравана і паспяхова працуе над вырашэннем дэмаграфічных праблем. Найпершая ўвага ў штодзённай рабоце ўдзяляецца прапагандзе сямейных каштоўнасцей, умацаванню сям'і, ахове дзяцінства і мацярынства.

Усё згаданае і абумоўлівае размяшчэнне ў святочным выпуску "ВГ" тэматычнай старонкі "Сямейнага жыцця вішнёвыя адценні", дзе вы, паважаныя чытачы, пазнаёміцеся з дзвюма выдатнымі сем'ямі, для якіх паняцце "вішня" адыгрывае немалаважную ролю.

**Яны пазнаёміліся ў год правядзення першага "Вішнёвага фестывалю" на Глыбоччыне. Быў май. Вішні аж прысядалі ад квецені. Год абяцаў быць ураджлівым не толькі на ягады, але і на маладое кіпучае яркае каханне. Хлопец і дзяўчына выпадкова сустрэліся на дыскатэцы. Яны маглі размінуцца не толькі ў той майскі вечар, але і ў жыцці. Вось толькі лёс распарадзіўся па-свойму: прымусіў маладых людзей паверыць у каханне з першага погляду і наканаваў адну дарогу на дваіх.**


Дзяніс і Анжаліка з дачушкай Дамінікай у вішнёвым садзе.

Праз год, у ліпені 2014 года, калі Глыбокае спеўна і ярка адзначыла юбілейную дату 600-годдзя з дня свайго заснавання, і яе жыхары рупліва збіралі ўраджай спелай сакавітай вішні, Дзяніс і Анжаліка ажаніліся. Яшчэ праз год у маладой сям'і нарадзілася дачушка Дамініка, якая сёлетнім летам разам з татам і мамай адзначыла першую гадавіну з дня нараджэння.

--Дзякуючы "Вішнёваму фестывалю", наша сям'я трапіла ў эпіцэнтр увагі, бо прозвішча Вішнеўскіх сугучна назве гэтага прыгожага мерапрыемства, -- гаворыць Дзяніс.

І калі ўлічыць, што асабістае жыццё мужа і жонкі Вішнеўскіх так цесна звязана з адметнымі гістарычнымі і сучаснымі датамі і падзеямі Глыбоччыны, калі дадаць, што яны – маладыя працавітыя і стараннныя і за імі – будучыня, то тут, як кажуць, "зоркі сышліся", і сям'я заслужыла ганаровае права быць на старонках святочнага "вішнёвага" нумара.

Дзяніс і Анжаліка нарадзіліся на Глыбоччыне, жывуць у Падсвіллі. Пасля школы Дзяніс скончыў Маладзечанскі політэхнічны каледж. Вось ужо тры гады працуе электраманцёрам участка Глыбоцкага РЭС. Нягледзячы на тое, што ажаніўся, абавязкаў і адказнасці стала больш, як і запланаваў, завочна паступіў у ВНУ, бо ўпэўнены, што спецыяльная адукацыя і практычныя навыкі дапамогуць стаць спецыялістам сваёй справы. Цяпер ён ужо студэнт 2 курса Беларускага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці энергетычнае забеспячэнне сельскагаспадарчай вытворчасці.

Анжаліка – нядаўняя выпускніца Віцебскага медыцынскага каледжа. Нейкі час працавала ў жаночай кансультацыі Глыбоцкай паліклінікі, затым – фельчарам-акушэрам у Падсвільскай бальніцы. Цяпер яна прызвычайваецца да новага статуса мамы.

Як маладым спецыялістам, дзяржава выдзеліла Вішнеўскім кватэру з выгадамі. Для пачатку сямейнага жыцця сацыяльнае жыллё -- ніядрэнны варыянт, але гаспадар выношвае мару пра будаўніцтва ўласнага дома, дзе абавязкова пасадзіць не адну вішаньку і дзе хопіць месца дзеткам-вішанькам…

--Ці дачушка народзіцца, ці сынок – будзем любіць аднолькава -- так думалі мы, чакаючы першынца, такой будзе і наша далейшая пазіцыя, -- кажа Дзяніс. – Галоўнае, каб дзеці раслі здаровымі, а пра іх шчасце і дабрабыт мы паклапоцімся.

Сямейны стаж маладой пары пакуль невялікі, усяго два гады, але пражыты час ужо дазваляе зрабіць пэўныя вынікі. Самы важны з іх, па словах Дзяніса, што ён не памыліўся з выбарам спадарожніцы жыцця. "А як жа інакш? Сэрца так падказала, -- прызнаўся, -- а яно падвесці не магло".

Жывіце ў згодзе і ладзе, беражыце сваё спелае каханне, імкніцеся да гармоніі адносін. Няхай ваша сумеснае жыццё будзе ўраджайным на дзетак, поспехі, добрыя навіны і, вядома ж, на смачныя салодкія вішні, якія звязалі вашы лёсы і дапамаглі роду Вішнеўскіх мецъ працяг.

# Расцём з «Вішнёвым фестывалем»!

● Алена ХАЙНОЎСКАЯ.
Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ і з архіва сям'і САКОВІЧАЎ.

– Бялюткія-бялюткія, як нявесты, – нашы вішанькі ўвесну, – расказвала глыбачанка Юлія Саковіч. – А цяпер, гляньце, якія ягадкі! Вялікія, сакавітыя! Ідуць дзеткі, дарослыя каля іх – кланяюцца дрэўцам, ласуюцца вішанькамі.

З Юліяй Браніславаўнай, яе мужам Здзіславам Францавічам і іх унукам Максімам *(на здымку)* мы сустрэліся два тыдні таму, калі на вішнёвых дрэўцах, пасаджаных ля іх дома, ужо можна было збіраць ураджай. Буйныя ягадкі сваім цяжарам аж згіналі галінкі ўніз.

– Гэта ранні сорт вішні, – патлумачыла гаспадыня. – Пасадзілі вішанькі ў 2012 годзе ў гонар адной падзеі: наш сталічны ўнучак Максім збіраўся паступаць у Глыбоцкую раённую гімназію. Такое рашэнне прынялі разам з яго бацькамі. Муж купіў вішанькі, адмыслова выбраўшы нізкарослыя, каб дзецям было зручна зрываць – у нас жа шасцёра ўнукаў. Садзіць дрэўцы прыйшлі і сябры-суседзі Максіма – Пеця Калантай і Арцём Вышадка. Дапамагалі дзядулю трымаць саджанцы, палівалі потым. Кожную вясну Максім свае дрэўцы беліць – гэта яго абавязак.


Вішанькі пры дарозе – на радасць гаспадарам і суседзям.

– А чаму пры дарозе пасадзілі вішні? – пацікавілася ў гаспадароў.

– На нашым участку шмат кветак, з іх толькі 14 кустоў руж. Таму і вырашылі: каля дарогі і дзеці, і прахожыя паласуюцца, і нам можа што перападзе – прыемна іншых радаваць тым, што ў нас ёсць, – адказалі Юлія Браніславаўна і Здзіслаў Францавіч.

На наступны год пасля пасадкі вішань Саковічы даведаліся, што ў Глыбокім будзе праходзіць "Вішнёвы фестываль". Вельмі ўзрадаваліся – угадалі з дрэўцамі. Радасць гаспадароў, здавалася, адчулі і маладзенькія вішанькі – столькі ягадак да першага фестывалю наспялілі з удзячнасцю за іх клопат.

– І цяпер вішанек уволю: і паесці, і на кампоты хопіць, але ж колькі было ў мінулым годзе! І варэння наварылі, і намарозілі для пірагоў, і пачаставалі многіх. Я ж, дзякуючы Максімкавым вішанькам, стала выпечкай займацца, – пахвалілася Юлія Браніславаўна. – Падзялюся з вамі нашым сямейным рэцэптам вішнёвага пірага, які мне дала дачка Света. Пяку яго часта: і на дні нараджэння, і да прыходу гасцей, і нават калі трэба Максімку на ўрокі ў гімназію. Хутка, смачна.



* * *

З вясны да восені два пышнаквіцёвыя вішнёвыя дрэвы, бы круглыя букецікі, разам з чырвоным полымем кустоў руж упрыгожваюць дом сям'і Саковічаў.

– Вясной вішанькі сваёй багатай квеценню віншуюць нас з нашымі майскімі днямі нараджэння. Мы ўдзячны прыродзе за шчодры падарунак, за імгненні радасці і прыгажосці! – не хавала эмоцый гаспадыня.

## Пірог з Максімкавых вішняў

Для цеста: 2 яйкі, 1/2 ч. л. солі, 1 шклянка кефіру ці 2 натуральныя ёгурты, 100 г маргарыну ці масла, 1 ч. л. разрыхляльніка, 250 г мукі (цеста павінна быць, як густая смятана), 100 г цукру, крыху ваніліну. Для начынкі: 450 г замарожанай вішні, цукар.

Узбіць масла з цукрам, дадаць яйкі, кефір, муку, ванілін, разрыхляльнік, добра перамяшаць. Выліць цеста ў змазаную алеем форму, выкласці зверху ягады (можна не размарожваць), пасыпаць цукрам. Выпякаць 30 хвілін (ці больш, да гатоўнасці) пры 200 °С. Упрыгожыць узбітымі вяршкамі (па жаданні).



# З добрай душой – увaходзь, *альбо* Пра вішню – паэтычным словам



• Алесь ЖЫГУНОЎ.
Фота Андрэя ПАНКРАТА.

На першым "Вішнёвым фестывалі" (2013 год) на галоўнай святочнай сцэне горада прагучалі дзве песні самадзейных кампазітараў Ганны Шаколы і Браніслава Грамакоўскага "Вішнёвы баль" і "Глыбокае -- вішнёвы гарадок", напісаныя на словы глыбоцкіх аўтараў. Канечне ж, дэбют песень быў прымеркаваны да першага фестывалю, і, прама скажам, песні прыйшліся даспадобы глыбачанам і гасцям горада.

Гучалі гэтыя творы на другім і на трэцім фестывалях. Прагучаць і на чацвёртым. Зрэшты, сэнс не ў гэтым, а ў тым, што вішня (дрэва і плод) яшчэ з даўніх часоў як мастацкі вобраз трывала прапісалася ў фальклоры, паэзіі, у песні. Згадаем беларускую народную песню "Зялёная вішня з-пад кораня выйшла", рускую – "Расцвела под окошком белоснежная вишня", вершы "Ты из шепота слов родилась и осыпала вишнёвый цвет" Аляксандра Блока, "Садок вішнёвы каля хаты" Тараса Шаўчэнкі, творы беларускіх паэтаў Паўлюка Труса ("Расчасалі вішні шоўкавыя косы і ўранілі долу снегавы вянок"), Максіма Багдановіча ("Цёмны сад-вінаград, свет бяленькі вішнёвы"), Іны Фраловай "Вішні" ("Вішні дома стаяць, як дзяўчаты"). Вішня натхняла і будзе натхняць таленавітых людзей на новыя цікавыя творы. У паэзіі вішня – пастаянны вобраз параўнання кветак вішні з воблакамі, снегам, месячным святлом. А яшчэ вішня абыгрываецца як вобраз дзяўчыны альбо маладой жанчыны.

Скажам, у вершы "Глыбокае – вішнёвы гарадок" сустракаюцца такія словы: "Вішні -- у кожным садзе, вішні – у тваім пaглядзе". У аўтара гэтых радкоў ёсць яшчэ пару твораў, дзе праходзіць вішнёвая тэма. Так, у вершы "Над маўклівым бяздоннем стаю" сустракаецца такое прызнанне лірычнага героя сваёй каханай: "Без тваіх без вішнёвых вачэй не магу я пражыць ні мінуты". А вось пра свой ранні верш "Бацькаў наказ" трэба сказаць асобна. Тут вішня як сімвал абнаўлення жыцця, шчасця і неўміручасці душы. Напрыканцы матэрыялу прывяду гэты твор цалкам:

*Поплечкі дужае цела*
*Кінуў пад прамяні.*
*--Вішня пабагацела,*
*Слухай, туды зірні.*
*Вось яна, сынку, сіла*
*Роднай – адчуй – зямлі!*
*Неба над намі сіняе,*
*Воблачкі праплылі.*
*--Вось яно, сынку, шчасце!*
*Ты разумееш хоць?*
*Свет вам расчынены насцеж,*
*З добрай душой – уваходзь!*

# Глыбоцкая вішанька

• Наталля БЕЛЬСКАЯ.
Фота з архіва рэдакцыі.




Глыбоччыну наведваюць шматлікія турысты. Так, у нас ёсць чым пахваліцца, ёсць што паглядзець! Два раскошныя храмы ў стылі барока, прыгожая пешаходная Цэнтральная плошча і набярэжная возера Кагальнае, алея славутых землякоў… А ў 2013 годзе, падчас першага "Вішнёвага фестывалю", у горадзе ўстанавілі помнік вішаньцы, аўтарам якога стаў скульптар з Віцебска Іван Казак. Манументальна-дэкаратыўная скульптура – тры спелыя барвовыя ягадкі на зялёным пастаменце – упрыгожыла цэнтр горада і адразу стала яшчэ адной глыбоцкай славутасцю. Хто б ні прыязджаў цяпер да нас, у Глыбокае, – не праміне ля вішань сфатаграфавацца на памяць. Такія здымкі, без сумневу, ёсць і ў альбомах многіх глыбоцкіх сямей.

З'явіўся помнік – з'явілася, традыцыйна, новае мясцовае павер'е. Кажуць: калі хочаш быць шчаслівым, трэба пацерці бачок такой сакавітай, хоць і гранітнай, ягадкі. Ці праўдзіць яно – невядома. Але ці не лепш перастрахавацца? Прыязджайце на Глыбоччыну любой парою, а найлепш – у ліпені, як паспеюць самыя смачныя глыбоцкія вішні, прыязджайце на "Вішнёвы фестываль"!



Экспазіцыя з выставы малюнкаў.

# Ягадка-натхненне

• Алена ХАЙНОЎСКАЯ. Фота з архіва рэдакцыі.

Вішанька – ягадка надзіў каларытная і сімпатычная. З даўніх часоў яна ў цудоўнай форме: вунь якой сакавітай захавалася на палотнах мастакоў розных эпох і краін (на прасторах Інтэрнэту іх багата можна ўбачыць). У хрысціянстве ёсць нават абразы, дзе Іісус Хрыстос-дзіця – з вішняй у руцэ.

Спакон вякоў вішня дарыла людзям чароўную квецень увесну, летам – спелыя ягадкі, натхняючы паэтаў, мастакоў, майстроў, цяпер фатографаў, на маляўнічыя, пяшчотна-лірычныя ці вясёлкава-яркія творы. Разам з "Вішнёвым фестывалем" глыбоцкія вішанькі, дзякуючы ўмелым рукам творцаў і іх багатай фантазіі, такія розныя… То яны рассыпаюцца на фотапаперы, то чырванеюць гуашавымі ці акварэльнымі бачкамі.

Ад фестывальных малюнкаў і фотаздымкаў вее свежасцю і цяплом, а яркасць фарбаў і вобразаў зачароўвае. Кожны год на "Вішнёвым фестывалі" ладзяцца творчыя выставы, і кожны год глыбачане: і маленькія, і дарослыя, столькі сюжэтаў з вішняй ствараюць – дзіву даешся.

Дзякуй, ягадка-натхненне!



На «вішнёвай» фотавыставе.

# Вішнёвы карагод



Сурвэткі з вішнямі-набіванкамі – як песня з крыніц спрадвечных.






Спеюць вішанькі на маляванках.

• Алена ХАЙНОЎСКАЯ.

Пaглядзіце, які вішнёвы карагод сувеніраў! І гэта толькі маленькая частачка таго, што ўбачылі мы за некалькі дзён да "Вішнёвага фестывалю" ў раённым Доме рамёстваў. Кожны майстар пастараўся, з густам, са смакам (некаторыя вішанькі хацелася і адкусіць), з фантазіяй паказаў харaство глыбоцкіх брэндавых ягадак. Абавязкова наведайце выставы рамеснікаў Глыбоччыны – без сувеніра не застанецеся. Глыбоцкія вішанькі (з воўны ці з дрэва, саломы ці гліны…) – чароўныя, бо і ў дажджлівую восень, і ў халодную зіму ўзнімуць настрой. Толькі гляньце на іх – усмешка і цёплыя ўспаміны пра лета і "Вішнёвы фестываль" гарантаваны.




Ягадкі з воўны вас сагрэюць і ўзімку.



Вішнёвыя выцінанкі.




Гліняныя вішні з глыбоцкім каларытам.




Драўляныя вішанькі такія крэатыўна-эксклюзіўныя.

Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

# Сувеніры да фестывалю

● Наталля БЕЛЬСКАЯ.
Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

"Вішнёвы фестываль" у Глыбокім у самым разгары. У вішнёвую сталіцу прыехалі і едуць шматлікія госці з Беларусі, далёкага і блізкага замежжа. Кожны сапраўдны турыст хоча прывезці з падарожжа памятны сувенір. Падарункі на любы густ з сімволікай Глыбокага і, безумоўна, "Вішнёвага фестывалю", з выявамі славутых мясцін нашага горада можна набыць у ФОТАцэнтры па вуліцы Леніна, 32.

Прадпрымальнік Іван Касевіч выпускае сувенірную прадукцыю даўно. Такая ідэя, па яго словах, нарадзілася выпадкова. Спачатку ўдалыя фотаздымкі маляўнічых куточкаў Глыбоччыны, зробленыя Іванам Касевічам, з'явіліся на паштоўках, каляндарыках і магніціках. Зараз у ФОТАцэнтры можна купіць брэлкі, кубкі, футболкі, сумкі, падушкі, бейсболкі… Прычым не толькі з глыбоцкімі краявідамі. Кожны пакупнік можа выбраць па каталозе ці прапанаваць свой варыянт малюнка, фотаздымка ці надпіса, які ў магазіне з дапамогай спецыяльнага абсталявання перанясуць, напрыклад, на футболку ці кубак.

Сям'я Касевічаў – прадпрымальная, ініцыятыўная і заўсёды адкрытая да ўсяго новага. Тры гады таму, калі ў нашым горадзе прайшоў першы "Вішнёвы фестываль", яны задумаліся аб выпуску сувенірнай прадукцыі з лагатыпам фестывалю. І сёння ў ФОТАцэнтры ці не самы багацейшы выбар сувеніраў з вішанькамі.

--Ідэя правядзення "Вішнёвага фестывалю" ў Глыбокім цікавая і неардынарная. Яна нам вельмі даспадобы, таму мы стараемся раскруціць гэты брэнд. У нас можна набыць сумкі, чайныя наборы і іншыя тавары з лагатыпам фестывалю. Вялікім попытам у турыстаў і гасцей карыстаюцца кубкі, майкі і бейсболкі. Іх з задавальненнем набываюць і глыбачане, -- далучаецца да размовы жонка Івана Касевіча Валянціна. -- У гэтым годзе да фестывалю рыхтаваліся адмыслова. Па прапанове старшыні райвыканкама Алега Морхата выпусцілі сувенірныя талеркі і насценныя гадзіннікі з краявідамі Глыбокага. А яшчэ – заказалі банер з эмблемай фестывалю, які ўпрыгожвае будынак ФОТАцэнтра. Нам падаецца, што гэта найлепшая рэклама для нашага "Вішнёвага фестывалю". Сёння праз Глыбокае едуць шматлікія падарожнікі, і яны павінны ведаць, што ў горадзе фэст.

Падчас фестывальнага тыдня ФОТАцэнтр, дарэчы, арганізуе выставу-продаж. Сувенірную прадукцыю з глыбоцка-вішнёвым каларытам можна купіць і на Цэнтральнай плошчы. На вуліцах Глыбокага можна сустрэць юнакоў і дзяўчат у футболках з лагатыпам фестывалю і бейсболках з надпісам "Я жыву ў сталіцы "Вішнёвага фэсту". Прыгожа і патрыятычна!



Валянціна і Іван Касевічы (справа) і работніцы ФОТАцэнтра Наталля Ермаковіч і Святлана Цяліца.


Сувенірная прадукцыя ФОТАцэнтра.









**У гэтыя дні ў Глыбокім, як ніколі, шмат гасцей. А прыехалі яны адусюль: здалёк і зблізку – з розных гарадоў і сельскіх населеных пунктаў Беларусі, а таксама з Расіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Грузіі, Малдовы…**

**І, як вядома, кожнаму прыезджаму чалавеку карціць пабольш даведацца пра вішнёвую сталіцу, палюбавацца выдатнымі мясцінамі нашага горада і раёна, набыць памятныя сувеніры. А таму прапануем дарагім гасцям зрабіць невялічкі экскурс па вішнёвым Глыбокім.**











Фота Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

# Расціце, вішанькі, на радасць людзям

• А. УСЦІНАЎ. Фота з архіва рэдакцыі.






Калісьці вішнёвыя сады ў нашым краі заклаў вядомы аграном Баляслаў Лапыр. Ён ахвотна дзяліўся саджанцамі вішні з жыхарамі навакольных вёсак. Паступова “лапыровы” вішні распаўсюджваліся і праз некаторы час раслі ўжо ці не ў кожным дворыку, ля кожнай сядзібы. Памяць пра добрага, інтэлігентнага чалавека, агранома Баляслава Лапыра захоўваецца і сёння.

І выдатнейшым пацвярджэннем таму, што справа вядомага садавода працягваецца, з’яўляецца «Вішнёвы фестываль» у Глыбокім. А яшчэ падзея гістарычнага значэння, і ў многім сімвалічная: у 2013 годзе, 30 красавіка пры ўездзе ў наш горад з боку Полацка па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле старшыні райвыканкама Алега Віктаравіча Морхата, старшыні раённага Савета дэпутатаў Галіны Уладзіміраўны Унуковіч ***(на здымку)*** адбылася закладка новага вішнёвага сада – 1414 маленькіх дрэўцаў (колькасць вішанек па даце першага ўпамінання горада Глыбокае; у 2014 годзе адзначаўся яго 600-гадовы юбілей).

У пасадцы вішнёвага сада ў год першага “Вішнёвага фестывалю” разам з кіруючым і грамадскім актывам раёна ўдзельнічалі глыбачане самага рознага ўзросту. Сёння сад падрастае, набіраюцца моцы маладзенькія вішанькі, якія праз некалькі гадоў парадуюць гараджан і гасцей Глыбокага салодкімі ягадамі. Цудоўна і тое, што кожны дбайны гаспадар пасадзіў на сваім зямельным участку маладзенькія вішанькі. Актыўна бяруцца за раяніраванне вішань і спрактыкаваныя садаводы Глыбоччыны. З самымі вядомымі сённяшняя наша сустрэча.

# Вішнёвым садам – быць!

• А. САДОВІЧ. Фота аўтара і Варвары ВАЯВОДАВАЙ.

Не адзін раз пісаў пра вядомага на Віцебшчыне фермера Вячаслава Мікалаевіча Сапрончыка, сялянская фермерская гаспадарка якога прызнавалася лепшай у вобласці. Больш таго: усім калектывам рэдакцыі мы ездзілі да яго і куплялі яблыкі: ну, вельмі ўжо яны смачныя!

Землі ў Сапрончыка – паўтары сотні гектараў. Большасць гектараў адведзена пад чорныя парэчкі і яблыні. Вырошчвае фермер таксама грушы, маліны, суніцы…


Фермер Вячаслаў Сапрончык.

А вось вішнёвага саду пакуль няма. Як жа так? Менавіта гэтае пытанне днямі задаў Вячаславу Мікалаевічу.

--У маёй праграме развіцця садаводства былі і вішні, -- заўважыў ён, -- але так атрымалася, што да вішань пакуль рукі не дайшлі. Але абавязкова дойдуць. І не толькі па той прычыне, што ў Глыбокім праходзіць “Вішнёвы фестываль” , хаця, прызнаюся, што і фестываль наводзіць на думкі, што вішнямі трэба заняцца. А як жа інакш! Вунь якая ўвага нададзена вішням на Глыбоччыне! Адусюль прыязджаюць у горад, каб купіць гэтыя смачныя сакавітыя ягады. На маю думку, сёння трэба вырошчваць усё, на што ёсць попыт. А на глыбоцкую вішню попыт ёсць.

Сваімі думкамі пра вішні папрасіў падзяліцца і Аляксандра Палікарпавіча Сясіцкага, садавода-аматара з Ломашаў, заслужанага і паважанага на Глыбоччыне чалавека.

--Сад у мяне невялічкі, у ім – яблыні і грушы розных сартоў. Мой любімы – “беларуская малінавая”. Яблыкі смачныя, пры тэмпературы да 6 градусаў захоўваюцца аж да мая, -- Аляксандр Палікарпавіч няспешна павёў свой расказ. – Былі і вішні, саджанцы набыў у Докшыцах. Я так думаю, што вішні на Глыбоччыну ў свой час прыйшлі па такім шляху: Маладзечна — Докшыцы – Глыбокае. Ужо ў Полацку вішань амаль няма, так, дзе-ніздзе яны ёсць, але не такія, як у Глыбокім.

--Днямі быў у Шаркоўшчыне. І там ёсць вішні, але яны не такія буйныя, як у нас, да глыбоцкіх вішань ім далёка, -- уставіў у размову і я пару слоў.


Садавод-аматар Аляксандр Сясіцкі.

--Не так і многа вішань і ў Ломашах, хоць ад Глыбокага да вёскі кіламетраў 50. Але скажу пра свае вішні. Ураджай давалі добры: з дзвюх-трох вішань мы набіралі да 10-15 вёдзер. Вішнёвае варэнне і цяпер у мяне ёсць. А вішань, на жаль, ужо няма: захварэлі і ссохлі. І думка мая такая: там, дзе вішні, як кажуць, вядуцца, іх трэба вырошчваць. Глыбоцкая вішня славіцца далёка за межамі раёна. І нас, жыхароў раёна, гэта не можа не радаваць.

Далей у размове заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі, ганаровы грамадзянін Глыбоцкага раёна, ардэнаносец Аляксандр Палікарпавіч Сясіцкі добрыя словы сказаў пра “Вішнёвы фестываль”, адзначыў, што кожны жыхар раёна павінен быць патрыётам і сваімі справамі і здзяйсненнямі праслаўляць родны край.

# ...И вишен спелых богатый урожай

• По материалам Интернет-ресурсов.

**Как в этом году весной цвели вишни! Будто бы белоснежным покрывалом укрылись улицы Глубокого и близлежащих деревень радовали глаз всех проходящих и проезжающих мимо… И как же теперь обидно многим хозяевам, когда их ожидания обильного урожая вишен не оправдались. Почему же так произошло?**

Причин плохого плодоношения вишни может быть несколько:

**1. Отсутствие сортов-опылителей.** Вишня является перекрестноопыляемым растением, т. е. для получения хорошего урожая требуется опыление пыльцой другого сорта. Поэтому рядом надо высадить любой другой сорт, который начинает цвести в это же время. Если ваш участок не позволяет посадить рядом растение, то нужно привить растущую у вас вишню. Можно весной, когда вишни начинают цвести, просто наломать вишневых веток в другом месте, поставить их в ёмкость в водой и закрепить в кроне вашего дерева. Только учтите, что это должны быть обязательно другие сорта.

Существуют и самоплодные сорта, но они также значительно лучше плодоносят, когда имеются сорта-опылители.

**2. Вымерзание цветковых почек.** Чаще всего вымерзание наблюдается на сортах, плодоносящих на букетных веточках, а также в суровые зимы и зимне-весенний период, когда оттепели чередуются с морозами. В начале вегетационного периода подмерзшие почки, не раскрываясь, засыхают и осыпаются. Чаще подмерзают почки у ослабленных растений, имеющих слабый прирост и светло-зеленые листья, а также в том случае, когда летний период предшествующего года был засушливым, и не было поливов.

**3. Подмерзание раскрывшихся цветков.** Раскрывшиеся цветки погибают при температуре минус 2° С, а завязи даже при минус 1° С. Вооружившись лупой, внимательно рассмотрите цветки. Если верхняя часть пестика (рыльце) почерневшая, значит, важная его часть погибла, опыления и оплодотворения завязи быть не может. Следовательно, не будет и урожая.

Уберечь сад от возвратных заморозков не просто. Поэтому в местах, где они часто случаются, стараются задержать начало цветения вишен, сохраняя под ними снеговой покров как можно дольше.

**4. Малое количество насекомых опылителей.** Кроме того, надежность опыления во многом зависит от погодных условий: холод, дождь, ветер ограничивают полеты насекомых, да и процесс прорастания пыльцы на рыльце пестика связан с температурными и другими условиями дня.

**5. Выращивание на кислых почвах.** Если почвы не известковать, то у вишни может наступить «минеральное голодание», когда она плохо усваивает питательные элементы из почвенного раствора. Вишня довольно требовательна к почве, на которой растет. Кислотность ее должна быть близкой к нейтральной, а глубина грунтовых вод – не менее 1,5 метра. Торфяники нужно обязательно известковать, а в песок добавлять глину и органику. Кроме того, на известкованной почве может не хватать бора, без которого завязи не образуются. Чтобы этого не случилось, осенью, во время перекопки приствольных кругов добавьте в землю перепревший навоз и сухую древесную золу – 0,5 стакана на каждый квадратный метр.

**6. Посадка.** Для посадки надо выбирать такое место, где прямые солнечные лучи падают с раннего утра и держатся хотя бы до второй половины дня, а ещё лучше – до вечера. Для вишни совершенно недопустима заглубленная посадка, когда корневая шейка находится ниже уровня почвы. Такие растения можно отличить по отсутствию прироста и угнетенному виду.

**7. Полезное соседство.** Благоприятное влияние на вишню могут оказывать другие растения, посаженные рядом. Например, жасмин (чубушник), гладиолусы, ноготки, примула, роза, хоста, люпин, клубника, малина, йошта (гибрид крыжовника со смородиной), репа, горох. Нежелательно размещать вблизи от вишни хвойные, яблони, жимолости, лилии, наперстянки, нарциссы, тюльпаны, анютины глазки, ирисы, спиреи, морковь, петрушку, сельдерей.

# ПРОГРАММА

## проведения районного праздника «Вишнёвый фестиваль» в г. Глубокое

### 18 июля (понедельник)

**День общественных объединений «Вишнёвая энергия»**

*Центральная площадь.*

17.00 – 20.00 Работа тематических площадок общественных объединений.
17.30 – 18.00 Церемония открытия Дня общественных объединений «Вишнёвая энергия».
18.00 – 20.00 Концерт коллектива художественной самодеятельности ОАО «Глубокский молочноконсервный комбинат».
20.00 – 22.00 Выступление вокально-инструментального ансамбля «Сиеста».

### 19 июля (вторник) День спорта «Олимпийская вишня – 2016»

*Городской стадион.*

17.00 – 18.00 Экспресс-оценка физического состояния «Вишня – энергия жизни».
17.00 – 18.00 Вишнёвая акция «Запишись в спортивную школу и физкультурно-оздоровительный центр».
17.00 – 20.00 Вишнёвое ассорти игровых видов спорта «Мяч в игре»: стритбол, волейбол, бадминтон, футбол…
17.00 – 22.00 Фотовыставка «Спортивная вишня».
17.30 – 20.30 1-я спартакиада Глубокского района среди руководителей учреждений, предприятий, организаций и работников государственных органов «Вишнёвая элита – 2016».
18.00 – 19.00 Интерактивная площадка «Глубокое – город здоровья и знаний».
18.00 – 19.00 Открытый Чемпионат города по практической стрельбе «Вишнёвая косточка».
18.00 – 19.00 Забег вишнёвых улиток «Исполнение желаний».
18.00 – 19.00 Соревнования по тоурестлингу.
20.00 – 21.00 Спорт-площадка «Вперед к рекордам».
20.30 – 21.30 Турнир «Самый сильный глубочанин».
20.30 – 21.30 Спортивный квартал «Физическая Гармония» – показательные выступления спортсменов, танцевальных групп, фитнес-групп.
21.00 – 22.00 Турнир по силовому экстриму и армрестлингу «Вишня – хит».
21.30 – 22.00 Вишнёвый забег на каблуках «Вишнёвые ножки».

### 20 июля (среда) День молодежи «Вишнёвая феерия»

17.00 – 18.30 Вишнёвый фото-квест.
*Набережная озера Кагальное.*
18.30 – 19.50 Авто-шоу «Молодежь, спорт, дружба!»
*Автодром Глубокской РОС ДОСААФ.*
20.00 – 21.00 Конкурсная программа «Вишнёвые парочки».
*Центральная площадь.*
21.30 – 23.00 Танц-кейс «Вишнёвое настроение».

### 21 июля (четверг)

**Тематическая программа «Поэтический вишнёвый дворик»**

*Центральная площадь.*

17.00 – 19.30 Поэтические встречи «Вишнёвое настроение». Творческий концерт Анны Шакола.

### 22 июля (пятница) Тематическая программа «Этно-вишня»

11.30 – 16.00 Инвестиционный форум.
*Дом культуры (ул. Коммунистическая, 10).*
14.00 – 16.30 Научно-практическая конференция по садоводству.
*Зал заседаний Глубокского районного исполнительного комитета.*
17.00 – 17.30 Открытие выставки живописи Фёдора Ястреба «Вясёлкавы след».
*ГУК «Глубокский историко-этнографический музей» ул. Энгельса, 24.*
17.00 – 21.00 Выставка-ярмарка работ народных мастеров «Вішнёвы кірмаш».
*Центральная площадь.*
17.30 – 21.00 Этно-вечеринка «У вішнёвым садзе» (хороводы, мастер-классы по танцам с участием зарубежных коллективов).
*Центральная площадь.*

### 23 июля (суббота) Вишнёвый край

09.00 – 09.40 Пресс-конференция.
*Зал заседаний Глубокского районного исполнительного комитета.*
09.40 – 10.00 Гашение почтовой марки в честь «Вишнёвого фестиваля» г. Глубокое специальным почтовым штемпелем.
*Зал заседаний Глубокского районного исполнительного комитета.*
10.00 – 10.30 Выставка-дегустация кулинарных изделий «Вишнёвые гостинцы».
*Торговый центр «Родны Кут».*
10.30 – 11.00 Торжественное шествие «В гостях у Вишни».
*г. Глубокое, ул. Ленина.*
11.00 – 11.30 Открытие скульптуры «Семья».
*Центральная площадь.*
11.30 – 12.30 Праздничная программа «Виват, фестиваль!».
*Центральная площадь.*
12.00 – 13.30 Смотр-конкурс подворий «Вішнёвыя прысмакі».
*г. Глубокое, ул. Ленина (от 1 до 2 светофора).*
12.30 – 14.00 Концертная программа «Вишнёвый калейдоскоп».
*Центральная площадь.*
13.00 – 16.30 Гала-конференция.
*Дом культуры (ул. Коммунистическая, 10).*
14.00 – 15.00 Концерт живой музыки «Музыка вновь звучит».
*Набережная озера Кагальное.*
15.00 – 15.30 Вишнёвая свадьба.
*Сквер молодоженов.*
15.30 – 17.00 Конкурс баянистов «А гармонік грае-грае».
*Центральная площадь.*
17.00 – 18.00 Презентация коллекции льняной одежды «Цветной лён-2». Выступление группы «Литы талер».
*Центральная площадь.*
18.00 – 20.00 Концерт зарубежных коллективов «Венок дружбы».
*Центральная площадь.*
20.00 – 20.30 Торжественная церемония закрытия районного праздника «Вишнёвый фестиваль».
*Центральная площадь.*
20.30 – 21.00 Аукцион «Вишнёвый пирог».
*Центральная площадь.*
21.00 – 22.30 Эстрадная программа «Вишнёвый MIX».
*Центральная площадь.*
22.30 – 01.00 Молодежная дискотека «Вишнёвая битва» с участием ди-джеев.
*Центральная площадь.*
23.00 Праздничный фейерверк.
*Центральная площадь.*

### В программе праздника:

09.00 – 15.00 Работа подворий «Вішнёвыя прысмакі».
*г. Глубокое, ул. Ленина (от 1 до 2 светофора).*
Гашение почтовой марки в честь «Вишнёвого фестиваля» в г. Глубокое специальным почтовым штемпелем.
*Площадка около Глубокского центра традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40).*
09.00 – 22.00 Фотовыставка «Вишнёвые детки»; арт-проект «Вишнёвая сказка»; выставка «По следам «Вишнёвого фестиваля» *(возле Глубокского центра традиционной культуры и народного творчества (ул. Ленина, 40.).* Работа торговых рядов *(по ул. Энгельса, Гагарина, Московская)*; тематических площадок *(Центральная площадь)*. Выставка-ярмарка работ народных мастеров «Вишнёвый вернисаж», «Ремесленный базарчик», мастер-класс *(ул. Ленина)*.
09.00 – 18.00 Туристическая ярмарка.
*Набережная озера Кагальное.*
22, 23, 24 июля с 9.00 до 21.00 – участие Витебского аэроклуба имени А.К.Горовца.

# Поздравляем!

**Светлану Владимировну ФУРС**

Сердечно поздравляем с юбилеем! Желаем счастья, здоровья, долголетия.

*Пусть юбилей сулит побольше*
*Удачных и погожих дней!*
*Успех пусть радует подольше,*
*Улыбки близких и друзей.*
*Пусть настроение, здоровье*
*Не покидают никогда.*
*В достатке, счастливо, с любовью*
*Живётся долгие года!*

**Сестра, швагер, крестник, крестница и их семьи.**

**Галину Эдвардовну КУРАШЕВИЧ**

Поздравляем с юбилеем!

*Пятьдесят -- это жизнь на вершине,*
*Это мудрый и опытный взгляд.*
*Седина на висках, сеть морщинок --*
*Это значит, уже пятьдесят!*
*Пятьдесят -- промежуточный финиш,*
*Пятьдесят -- промежуточный старт,*
*Пятьдесят -- это только всего лишь,*
*Не уже, а ещё пятьдесят!*

**Коллектив фермы «Удело» УП «За Родину».**

**Викторию Викторовну ЛЕОНОВИЧ**

Дорогая жена, мамочка и бабушка! Сердечно поздравляем с юбилеем!

*Не считай понапрасну года,*
*Не грусти, что виски поседели.*
*Так бывает в природе всегда:*
*Это след оставляют метели.*
*Пусть нелёгкой была твоя жизнь,*
*Были всё ж в ней и радость, и счастье.*
*Ты крепись, дорогая, держись,*
*Обойдут стороною ненастья.*
*Ведь богатство твоё -- это мы:*
*Сыновья, дочка, внуки и правнучек даже!*
*Долго-долго ещё ты живи,*
*Чтоб праправнуков тоже понянчить!*

**Муж, дети, внуки.**

«Веснік Глыбоччыны»
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, раённы Савет дэпутатаў.
Выходзіць у сераду і суботу.
Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйны № 73 ад 3 сакавіка 2009 г. Індэкс 63968.

Аўтары нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.

Адрас: 211800, г. Глыбокае, вул. Чырвонаармейская, 2.
E-mail: glubokoe@vitebsk.by

Тэлефоны:
рэдактара – 2-13-39,
намесніка рэдактара – 2-24-85,
адказнага сакратара і аграпрамаддзела – 2-11-46,
аддзела сацыяльных праблем і сувязей з грамадскасцю – 2-11-45,
бухгалтэрыі – 2-11-48 (факс),
аддзела рэкламы – 2-13-39 (факс).

Р/р 3012024925589 у ЦБП № 208 ф-ла № 216 ААТ «ААБ Беларусбанк» у г. Полацку. МФА 648, УНП 300022458, АКПА 02478065

ISSN 2075-7948

Намеснік галоўнага рэдактара Анатоль Усцінавіч ЗІНКЕВІЧ

Дызайн і вёрстка Сяргея Краўчонка.

Карэктар Іван Букоўскі.

Газета набрана на настольна-выдавецкай сістэме ў рэдакцыі, перададзена па каналах сувязі і надрукавана ў КУП «Наваполацкая друкарня»: вул. Блахіна, 26. Друк афсетны.

Падпісана ў друк 19.07.2016 г. у 17.00. Заказ № 3394. Тыраж 6362.